# ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ І ПАКАЛЕННЯЎ У РАМАНЕ-СПОВЕДЗІ А. САВІЦКАГА «ПІСЬМО Ў РАЙ»

***А. К. Дзенісевіч***

**Ліцэй № 2 (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – А. К. Пекач, настаўнік беларускай мовы і літаратуры, настаўнік-метадыст***

**Анатацыя.** У артыкуле вызначаецца сутнасць паняццяў «споведзь», «літаратурная споведзь»; аналізуецца раман-споведзь А. Савіцкага «Пісьмо ў Рай»; раскрываецца ідэйна-сэнсавы змест твора.

**Ключавыя словы:** споведзь; літаратурная споведзь, спрадвечныя каштоўнасці, маральныя нормы.

Раман-споведзь А. Савіцкага «Пісьмо ў Рай» – творчая ўдача пісьменніка. Гэта не толькі споведзь чалавека перад бацькам, а і перад усімі намі, а яшчэ споведзь кожнага сына перад бацькам, кожнага мужчыны перад сваім народам, перад Айчынай. Гэта споведзь цэлага пакалення пакаленню папярэдняму і наказ пакаленню наступнаму. Гэта споведзь праз час: *бабуля – бацька, маці – сам герой, сам суайчыннік, сам А. Савіцкі – дзеці – унукі.*

Твор дапамагае дапамагае ўсвядоміць сваю адказнасць у гістарычным ланцужку *я – сям'я – род – народ – чалавецтва*. Твор цікавы духоўнымі, маральнымі, вечнымі каштоўнасцямі і той сілай духу, моцай, стойкасцю, якія дасталіся сыну ад бацькі і дапамагалі ў самыя цяжкія і вырашальныя, пераломныя моманты жыцця. Раман дапамагае раз і назаўсёды зразумець, што самая моцная на свеце любоў – любоў бацькоў, што вышэй за гэтую любоў няма нічога на свеце і такой жа павінна быць і любоў дзяцей да бацькоў. Становіцца відавочна, што мы жывём не толькі ў сям'і, а і ў грамадстве, што падзеі грамадскія звязаны з лёсам кожнай сям'і, з лёсам кожнага з нас і падзеі гэтыя павінны хваляваць нас.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дакументальная проза, ці нон-фікшн, – гэта своеасаблівы літаратурны жанр, які характарызуецца тым, што сюжэтная лінія пабудавана на рэальных падзеях. Тая плынь, што ўзаемадзейнічае з мастацкай літаратурай, падзяляецца на дакументальна-мастацкую і аўтабіяграфічную прозу [2, с. 222].

Паводле жанрава-стылёвай структуры аўтабіяграфічных твораў выдзяляюцца наступныя формы: дзённікі, мемуары, споведзі, нататкі, успаміны, аўтабіяграфіі, хронікі, запіскі, лісты прыватнага зместу, нарысы, мастацкія апавяданні, аповесці, раманы.

Як адзначае Т. Тарасава, спавядальная манера аўтабіяграфічных твораў можа выконваць пэўныя функцыі:

1) узмацняць тэндэнцыі да самавыяўлення;
2) вызначаць эмацыянальна-ацэначныя прыярытэты асобы;
3) выступаць сродкам інтымізацыі аповеду;
4) выконваць камунікатыўную функцыю [7, с. 212].

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы сведчыць пра мнагазначнасць слова споведзь. У хрысціянскай царкве – гэта «пакаянне ў сваіх грахах перад свяшчэннікам і дараванне ім грахоў» [8, т. 5, кн. 1, с. 269]. У пераносным значэнні – гэта «шчыры расказ пра ўласнае жыццё; прызнанне ў чым-небудзь» [8, т. 5, кн. 1, с. 269].

Споведзь – літаратурна-мастацкі твор ці яго частка, дзе аповед вядзецца непасрэдна ад асобы аўтара і вымагае ад яго поўнай адкрытасці, даверлівых адносін з чытачом, упускаючы яго ў самыя патаемныя глыбіні свайго ўнутранага свету [5].

Літаратурныя споведзь – ліра-эпічная мадэль аповеду, цэнтрам якой становіцца сам аўтар, а логіка аповеду падпарадкавана самарэфлексіі аўтара. У творы ад першай асобы апавядаецца пра рэальныя падзеі ў жыцці чалавека, перадаюцца ўнутраныя перажыванні. Элементы пропаведзі, аўтабіяграфіі і пакаяння з’яўляюцца не галоўнымі, галоўная ж мэта літаратурнай споведзі – імкненне аўтара да самавыражэння [6, с. 5].

Літаратурная споведзь не з’яўляецца таінствам, гэта не дыялог з Богам, а маналог аўтара-героя, звернуты urbi et orbi [1] – горада (г.зн. Рыма) і свету, што азначае «на ўвесь свет, усяму свету, усім і кожнаму». Асноўнымі мадэлямі літаратурнай споведзі з’яўляюцца споведзь-пропаведзь, споведзь-самавыражэнне, споведзь-аўтабіяграфія [6, с. 5].

Адраснасць – абавязковая ўмова спавядальнага маналогу. Спавядальнік разлічвае на адказ, хай і не вербальны, не зараз, не тут, а, можа быць, праз час, праз гады, праз пакаленні, праз стагоддзі. У гэтым каштоўнасць споведзі, у гэтым повязь і пераемнасць часоў і пакаленняў.

Спавядальны апафеоз усёй творчасці А. Савіцкага – раман «Пісьмо ў Рай». Неабходнасць выказвацца ад першай асобы ўзнікла ў Чалавека і Пісьменніка праз парушэнне грамадствам маральных каштоўнасцей і праз скажоныя адносіны да падзей мінулых. Моцны духам, непахісны ў сваіх перакананнях, перанятых ад бацькі, бабулі і маці, пісьменнік даводзіць нам, як даводзіў свайму ўнуку, што ў самай страшнай бядзе толькі чалавек ратуе чалавека, толькі дабро і спагада вядуць з цемры безнадзейнасці да жыцця і збавення, толькі памяць пра мінулыя пакаленні, шчырая праца, вера і надзея дазволяць непарушна трымацца на роднай зямлі і нашым дзецям і ўнукам.

Галоўны герой рамана-споведзі А. Савіцкага «Пісьмо ў Рай» Андрэй Смоліч з самага маленства спасцігаў і засвойваў павагу да працы, сумленнае стаўленне да яе, сумленнае стаўленне да таго, што робіш і што атрымліваеш у выніку. Запаветы бацькі «*сашчыраваў, маўляў, дзела – тады гуляй смела*» [4, с. 423], «*калі за справу ўзяўся, дык шчыруй сумленна, ад старання чырваней, а не з таго, што грабіў нягожа*» [4, с. 424] былі ў Смоліча з дзяцінства. Галоўны герой навуку гэтую перадаў і свайму ўнуку, бацькаваму праўнуку. Смоліч разумее, што «*вопыт бацькоў і дзядоў, што ўваходзіць у лёс новых пакаленняў, і ёсць, мабыць, тое асноўнае, дзеля чаго прыходзіць у гэты свет чалав*ек» [4, с. 525]. Дзякуючы раману-споведзі «Пісьмо ў Рай» мы можам глыбей спасцігнуць сутнасць і веліч працы людской, навучыцца шчыраваць сумленна і прыгожа, маем магчымасць задумацца пра тое, што пакінем пасля сябе, зразумець, што «*ўсё тое, што створана працаю, трэба не толькі шанаваць, але і абараняць ад расцяробу, ад гвалту і знішчэння*» [4, с. 530].

Галоўны герой рамана на працягу ўсяго жыцця змагаўся за праўду, волю і свабоду. Ён абараняў Радзіму падчас вайны, сумленна вёў журналісцкую працу, з павагай ставіўся да продкаў, лічыў, што неабходна падтрымліваць гістарычную памяць, каб маладыя людзі ўмелі адрозніваць дэмагогаў ад сапраўдных патрыётаў, ведалі, што радзіму трэба берагчы.

На вялікі жаль, людзі губляюць гісторыю, губляюць сябе, прадаюцца д’яблу, знішчаюць усё жывое, не памятаюць і не хочуць памятаць пра мінулае. І гэта самае страшнае. «...Разуменне асабістай адказнасці за лёс уласнай зямлі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

і цвёрдае жаданне ўзняць, пакласці гэтую адказнасць у першую чаргу на свае ўласныя плечы – толькі гэта і нішто іншае! – у сіле паўплываць на тое, якой будзе старонка нашага Сёння, што заўтра будзе гісторыяй» [3, с. 93].

Пачынаючы з самага маленства, А. Смоліч паказваў сваю ўпартасць у дасягненні пастаўленай мэты. Падчас вайны хлопец удзельнічаў у партызанскім руху. Ён адказваў за самыя важныя і небяспечныя справы. Калі пісаў пісьмы да Сталіна, настойлівасць не пакідала яго: пісаў адно, другое, трэцяе – упартасці хоць адбаўляй. Не проста настойлівасць, а апантанасць у рэалізацыі кнігі, дзякуючы якой герой ушаноўвае памяць свайго бацькі і разам з ім яшчэ і вялікай колькасці людзей, дазволіла чытачам з розных куткоў Зямлі далучыцца да гісторыі, да памяці пакаленняў.

На працягу рамана-споведзі галоўны герой усведамляе паняцце веры, разумее, што без веры жыццё немагчыма, што яна, вера, дапамагае пераадолець жыццёвыя цяжкасці, дапамагае сталенню і станаўленню яго як асобы. Здавалася, хлопец выхоўваўся ў сям’і, дзе вера не заахвочвалася. Усе былі закладнікамі часу, калі вера ў Бога пераследавалася, цэрквы і касцёлы знішчаліся. Адзіным чалавекам, як здавалася Андрэю, які ведаў, што такое верыць і што такое вера, была бабуля. Яна ніколі не пераставала жыць малітвамі. Ёй не перашкаджала нават тое, што родныя дзеці знеслі на гарышча такія дарагія ёй іконы, бо вера – яна не матэрыяльная, і зусім не абавязкова хадзіць у храм ці мець абразы. Споведзь перад бацькам прыводзіць да асэнсавання жыццёвага вопыту і жадання перадаць гэты вопыт сваім дзецям і ўнукам. Магчымасць паглядзець на сябе, на свой шлях ёсць і ў кожнага з нас. Такая магчымасць даецца, каб пазбегнуць памылак, каб пераасэнсаваць зробленае, падумаць пра будучае.

Раман-споведзь А. Савіцкага «Пісьмо ў Рай» раскрывае спрадвечныя каштоўнасці, маральныя нормы, якімі кіраваўся на працягу жыцця аўтар-герой (а гэта дабро, прыгажосць, мір, шчасце, каханне, сям’я, праца, любоў да роднай зямлі, захаванне памяці пакаленняў), вучыць спасцігаць веліч людской працы, шчыраваць сумленна і прыгожа, прымушае задумацца пра тое, што пакінем мы пасля сябе, а для гэтага пераконвае нас не толькі шанаваць, але і абараняць ад расцяробу, ад гвалту і знішчэння усё, што створана працаю.

Мы прыходзім да ўсведамлення, што няма вышэйшай святыні за помнікі, што стаяць на магілках нашых продкаў. Каб не згубіць сябе, не згубіць свой род, не згубіць памяць, не згубіць гісторыю, сваім прыкладам пісьменнік пераконвае нас вучыцца, атрымліваць адукацыю, мець праз усё жыццё цвёрдасць духу, сілу волі, настойлівасць, рашучасць. Усё гэта патрэбна для таго, каб узяць адказнасць за свае ўчынкі, за свой лёс, за лёс сваіх родных, а потым – і за лёс Радзімы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А. Савіцкі даводзіць, што вера – гэта само жыццё. І ўсе і заўсёды павінны жыць верай і надзеяй на лепшае. А вера ў справядлівасць – гэта яшчэ і рухавік жыцця. Усякая вера павінна трымацца на шчырым пакаянні, на маленні, на малітве, на споведзі Богу, Лёсу, Нябёсам, Продкам, Бацькам. Толькі так можа здарыцца дараванне, толькі так можна спадзявацца на духоўнае выратаванне кожнага паасобку і ўсіх разам, на выратаванне сям'і, роду, народа. Спавяданне дае спадзяванне.

## *Літаратура*


1. Латинско-русский словарь крылатых слов и выражений [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://dic.academic.ru/dic.nsf/latin_proverbs/2568/Urbi. – Дата доступа: 02.11.2017.
2. Новік, Г. Ю. Жанравая структура аўтабіяграфічнай прозы як адной з разнавіднасцей літаратуры нон-фікшн / Г. Ю. Новік // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы II Рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 19–20 лістап. 2015 г. – Віцебск, 2015. – С. 219–222.
3. Савіцкі, А. Пісьмо ў Рай : раман-споведзь / А. Савіцкі. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 221 с.
4. Савіцкі, А. Пісьмо ў Рай : раман-споведзь / А. Савіцкі // Гаспадар-камень : зб. сучас. беларус. прозы : для ст. шк. узросту. – Мінск, 2011. – С. 383–598.
5. Словарь литературных терминов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://litterms.ru/i/103. – Дата доступа: 15.10.2017.
6. Степина, А. Н. Формально-содержательные модели в древнерусской литературе : автореферат дис. ... канд. филол. наук : 10.01.01 / А. Н. Степина. – Москва, 2012. – 18 с.
7. Тарасава, Т. М. Беларуская проза XX стагоддзя ў еўрапейскім літаратурным кантэксце: экзістэнцыялізацыя духоўнага свету героя : дыс. ... док. філал. навук : 10.01.01 / Т. М. Тарасава. – Мінск, 2013.
8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР, Ін-т мовазн. імя Я. Коласа ; пад агульн. рэд. К. К. Атраховіча. – Мінск : БелСЭ, 1977 – 1984. – Т. 5.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ